**“Бібліятэка Я.Ф. Карскага: прыватная калекцыя беларускага і рускага вучонага-славіста ў фондзе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі” (2013–2016 гг.)**

Работа была зарэгістравана ў БелІСА. Мэта даследавання – выяўленне найбольшай колькаснай паўнаты экзэмпляраў былога прыватнага кнігазбору вучонага Яўхіма Фёдаравіча Карскага (1861–1931) у фондзе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і навуковае апісанне выяўленых адзінак, стварэнне агульнай характарыстыкі калекцыі. Кнігазбор рускага і беларускага вучонага, зачынальніка беларускага мовазнаўства і літаратуразнаўства, палеографа, фалькларыста і этнографа Я.Ф. Карскага налічвае каля 2 500 экзэмпляраў кніг і часопісаў. Ён паступіў у Нацыянальную бібліятэку Беларусі ў 1922 г., на самым першым этапе фарміравання яе фондаў і стаў каштоўным каменем у падмурку яе славістычных гістарычных калекцый. Кнігазбор утрымлівае літаратуру першай паловы XVIII – пачатку XX ст. па філалогіі, палеаграфіі, этнаграфіі, педагогіцы, падручнікі і навучальныя дапаможнікі, слоўнікі, фальклорныя зборнікі, мастацкую літаратуру ў арыгінале і перакладах, праграмы для збору этнаграфічных звестак, навуковую перыёдыку. Асаблівае месца займае вялікі рукапісны каталог, складзены былым уладальнікам. На кнігах маюцца ўладальніцкія паметы і пячаткі, дароўныя надпісы, маргіналіі. Сярод аўтараў дароўных надпісаў – К.Я. Грот, А. Мазон, А.Л. Пагодзін, А.І. Сабалеўскі, Л.У. Шчэрба і інш. (усяго каля 600 аўтографаў). Значная частка калекцыі алічбавана.